# АСАБЛІВАСЦІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК "ПАМЯЦЬ" ЯК НОСЬБІТАЎ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

Т.В.Кузьмініч (аспірант)

З абвяшчэннем незалежнасці нашая дзяржавы цесна звязаны працэсы адраджэння нацыянальнай культуры, мовы, гісторыі. У апошнія гады друкуецца шмат матэрыялаў гістарычнай тэматыкі на старонках часопісаў і газет ("Спадчына", "Полымя", "Культура", "Літаратура і мастацтва" і інш.). Выйшлі ў свет такія фундаментальныя выданні, як "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі" "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі", энцыклапедычныя даведнікі "Ф.Скарына і яго час", "Этнаграфія Беларусі", рыхтуецца да друку "Беларуская гістарычная энцыклапедыя" і г.д.

Выданні гісторыка-нацыянальнага зместу павінны вырашаць не толькі задачы асэнсавання і захавання спадчыны, але і папулярызацыі гістарычных ведаў. У гэтым сэнсе вельмі цікавымі, на наш погляд, з'яўляюцца хроніка-дакументальныя выданні "Памяць". Мяркуецца кожнаму раёну Беларусі прысвяціць асобную хроніку (на сённяшні дзень выпушчана - восем).

Наогул, сучасныя гістарычныя хранікальныя выданні, спалучаючы ў сабе фактаграфічную і бібліяграфічную інфармацыю, з'яўляюцца цікавымі даведачнымі выданнямі. Як правіла, яны маюць навукова-дапаможны характар, даволі строгую структуру, разгалінаваны даведачны апарат. Складальнікі "Памяці" мелі на мэце стварэнне навукова-папулярных хронік; вялікаму інфармацыйнаму матэрыялу нададзена пэўная эмацыянальная ўзрушанасць. Ствараліся гэтыя хронікі на падставе архіўных, музейных матэрыялаў, кніг, газетных і часопісных артыкулаў, успамінаў удзельнікаў падзей. Кожнае выданне дае разнабаковую характарыстыку таго ці іншага раёна. Разам з фрагментамі афіцыйных дакументаў тут прадстаўлены успаміны, урыўкі з пісьмаў, фотаздымкі, вершы, рэпрадукцыі - сабраны цікавы гістарычны, краязнаўчы матэрыял, які можа зацікавіць шырокае кола чытачоў: ад навукоўцаў да ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй таго ці іншага раёна, ці проста хоча знайсці ў кнізе прозьвішча свайго загінуўшага суайчынніка. Мы лічым,што вялікі фактычны матэрыял, сабраны ў гэтых выданнях, павінен быць

ручным у карыстанні, удала структураваным і шматаспектна адлюстраваным у дапаможных паказальніках. Можна прапанаваць больш традыцыйную структуру выдання: падаць спачатку увесь тэставы матэрыял, а розныя спісы сканцэнтраваць у дадатках. Можна пагадзіцца з прынятай групоўкай матэрыялу, але бясспрэчна тое, што неабходны разнастайны даведачны апарат, які б зрабіў выданне яшчэ больш цікавым і значна б аблегчыў пошук інфармацыі. Гэта асабліва важна для работы бібліятэкараў, таму што гісторыка-дакументальныя хронікі "Памяць" з'яўляюцца крыніцай выканання шматаспектных фактаграфічных запытаў. На жаль, даведачны апарат гэтых выданняў абмежаваны толькі уступным словам "Да чытача" і сціплым "Зместам" аб асноўных раздзелах (толькі у першых трох хроніках даецца пералік усіх змешчаных матэрыялаў).

Гэтыя выданні канцэнтруюць багаты матэрыял з музеяў, архіваў, кніг, часопісаў, газет. На наш погляд, неабходным з'яўляецца не толькі спасылкі на крыніцы надрукавання, выяўлення таго ці іншага матэрыялу, але і аб'яднанне усіх гэтых крыніц у адпаведным паказальніку. Больш таго, мы лічым мэтазгодным увядзенне у хроніку дадатка "Літаратура пра раён". Надрукаванне такіх бібліяграфічных дадзеных не толькі б значна павысіла інфармацыйны патэнцыял, але і зрабіла б магчымым двухузроўневае выкарыстанне гэтага выдання. На першым – чытачу дастаткова той фактаграфічнай інфармацыі, якая ёсць у хроніцы, на другім – ён можа весці дадатковае даследаванне па крыніцах, да якіх адсылае выданне. Мэтазгодным, на наш погляд, з'яўляецца і складанне прадметнага паказальніка матэрыялаў, змешчаных у хроніках. Гэта зробіць больш разнабаковым і шматаспектным іх пошук.

Гісторыка-дакументальныя хронікі "Памяць" маюць пэўную ідэалагічную афарбоўку. Нават дзве апошнія, што выйшлі у свет у 1992 годзе (прысвечаныя Лезнінскаму і Пружанскаму раенам) не поўнасцю пазбавіліся ад яе. Праўда, тут можна знайсці матэрыял аб ахвярах сталінскіх рэпрэсій, пералік рэлігійных абшчын, змяніліся і назвы галоўных раздзелаў, але пакуль што змест асноўных матэрыялаў не сведчыць аб яго дэідэалагізацыі.

Такім чынам, складальнікамі гісторыка-дакументальных хронік "Памяць" праведзена і праводзіцца вялікая навукова-даследчая праца, вынікам якой з'яўляюцца выданні, якія у цэлым адпа-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вядаюць жанру хронікі падзей і разам з тым маюць адметныя рысы. У выданнях сканцэнтраваны багаты інфармацыйны матэрыял, выяўлены з разнастайных крыніцаў (ад афіцыйных дакументаў – да мастацкіх твораў). Спалучэнне матэрыялаў розных па аб'ему, стылю, форме, мастацкавобразныя назвы асноўных раздзелаў – усе гэта забяспечвае навукова-папулярны характар хронік, робіць магчымым выкарыстанне іх шырокім колам чытачоў. Не гледзячы на недасканаласць даведачнага апарату саміх выданняў, яны могуць аказаць вялікую дапамогу бібліятэкарам у выкананні фактаграфічных запытаў. А пры ўмове удасканалення даведачнага апарату і дэідэалагізацыі матэрыялаў інфармацыйныя якасці выданняў значна палепшацца.

## МЕСЦА І РОЛЯ ШКОЛЫ "АНАЛАЎ" У СУСВЕТНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУЦЫ

Н.Р.Кошалева

У апошнія некалькі гадоў навукоўцы рэспублік СНД атрымалі значна большыя магчымасці для знаемства з даследаваннямі розных школ і напрамкаў сусветнай гістарычнай навукі. Асабліва важнымі з'яўляюцца даследаванні школы "Аналаў" альбо пазнейшай "Новай гістарычнай навукі". Як сведчыць амерыканскі гісторык Л.Стоун, гэтая школа, якая сфармавалася паміж дзвума сусветнымі войнамі, аднавіла гістарычныя веды і зрабіла папярэдняе 40-годзе найбольш прадуктыўным і творчым перыядам сусветнай гістарыяграфіі. Працы яе прадстаўнікоў (Марк Блок, Люсьен Фэвр, Жак Легоф, Імануіл Ле-руа-Ладзюры, Марк Фэро, Фернан Брадэль і інш.) па свайму зместу з'яўляюцца найбольш абагульняючымі і сінтэтычнымі сярод гістарычных даследаванняў. Так, напрыклад, у прадмове да свайй фундаментальнай працы "Цывілізацыя сярэдневяковага Захаду" Жак Легоф адзначаў: "Гэтая кніга адпавядае задачам серыі "Вялікія цывілізацыі" і маей канцэпцыі гісторыі, у прыватнасці гісторыі цывілізацый". Прыхільнікі школы "Аналаў", якія абгрунтавалі канцэпцыю татальнай гісторыі, падкрэсліваюць, што яна пазбягае паняццяў "базіс" і "надстройка", бо яны наследуюць разуменне гістарычных структур і іх узаемадзеяння. Згодна іх перакананняў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ